ДЭПУТАТ І ЖЫЦЦЁ

# МОЦНЫЯ РУКІ


**Ц. Я. КІСЯЛЁЎ**

**Старшыня Савета Міністраў Беларускай ССР**


Шырокім крокам ідзе савецкі чалавек да камунізма. Праграма нашай партыі ўказвае яму верны і прамы шлях да вялікага шчасця.

Савецкая ўлада стварыла ўмовы для развіцця талентаў і здольнасцей кожнага чалавека. І бачачы, адчуваючы гэта, шырокія масы няспынна клапоцяцца аб умацаванні і працвітанні сваёй роднай улады. Без такіх клопатаў і падтрымкі Саветы і дзяржаўны апарат не змаглі б паспяхова вырашаць вялікія і складаныя задачы камуністычнага будаўніцтва.

У гэтыя дні ў Беларусі ўдзельнічае ў шматграннай рабоце мясцовых Саветаў больш чым пяцісоттысячная армія актывістаў— прадстаўнікоў самай шырокай грамадскасці. Гэта сіла, якая будзе са дня ў дзень расці, усё смялей і шырэй прыцягвацца да кіравання дзяржавай, да кіравання гаспадарчым і культурным будаўніцтвам. Вельмі складаны і нязведаны яшчэ працэс паступовага ператварэння органаў дзяржаўнай улады ў органы грамадскага самакіравання. Але ён пачаўся ўжо і знаходзіць сваё яркае адлюстраванне ў той велізарнай рабоце, якую пасля XXII з'езда КПСС разгарнула грамадскасць у нашай краіне.

У мясцовых Саветах рэспублікі звыш дзесяці тысяч пастаянных камісій. Яны аб'ядноўваюць

цы скасавана 38 раёнаў і каля 300 сельскіх Саветаў. Справа не толькі ў тым, што краіна сэканоміла мільёны рублёў. Гэта дало магчымасць умацаваць і зрабіць больш жыццяздольнымі нізавыя звенні дзяржаўнага апарату, павысіць іх аўтарытэт. Могуць спытаць: чаму ўзбуйненне раёнаў і сельскіх Саветаў адбылося за апошнія два гады, а не раней? Скажам прама, уся справа ў тым, што раней мала прыцягвалася да работы грамадскасць. Цяпер жа ва ўсіх абласцях і раёнах на дапамогу мясцовым Саветам прыйшла вялікая армія энтузіястаў, якія робяць тое, што раней лічылася пад сілу толькі людзям «асобай прафесіі»—апаратным работнікам.

Прыцягваючы грамадскасць да кіравання дзяржаўнымі справамі, мы павінны вучыць людзей, смялей давяраць ім.

**Цяпер у рэспубліцы разгортваюцца палявыя работы. Калгасы і саўгасы маюць усе магчымасці правесці сяўбу хутка і добра, паспяхова завяршыць першы этап барацьбы за высокі ўраджай.**

Якая спрыяльная глеба, якія шырокія гарызонты адкрываюцца сёння перад сельскім актывам! Хіба не больш паспяхова будзе ісці работа на палях і фермах, калі разам з аграномам, брыгадзірам, звеннявым у барацьбу за круты ўздым сельскай гаспадаркі ўключыцца шматтысячная армія дэпутатаў Саветаў, грамадскіх кантралёраў, членаў камісій садзейнічання павышэнню ўраджайнасці, інспекцый па якасці рамонту і выкарыстання тэхнікі. Трэба зрабіць усё, каб яны сталі сапраўднымі памочнікамі тэрытарыяльных упраўленняў, кіраўнікоў калгасаў і саўгасаў, партыйных, савецкіх, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый.

У гэтыя веснавыя дні на Салігорскім калійным камбінаце, Мінскім трактарным заводзе, «Гомсельмашы» і іншых прадпрыемствах рэспублікі, якія пастаўляюць мінеральныя ўгнаенні і машыны для сельскай гаспадаркі, гарача [illegible] Васкрасенскага хімічнага камбіната. Хімікі і машынабудаўнікі Беларусі аднадушна заяўляюць:

— Мы дадзім звыш плана дзесяткі тысяч тон мінеральных угнаенняў. Сотні звышпланавых машын, створаных нашымі рукамі, атрымаюць калгасы і саўгасы.


З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ